**Білет 17**

**Практычнае заданне.**

**Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Удзел БССР у стварэнні СССР. Узбуйненне тэрыторыі БССР.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Калі было абвешчана ўтварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі (ССРБ)?
2. Чаму беларуская дзяржава называлася савецкай? Свой адказ пацвердзіце цытатай з прадстаўленых матэрыялаў.
3. Калі і кім было прынята рашэнне аб уваходжанні ССРБ у склад Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік?
4. Складзіце храналагічную табліцу па пытанні: «Працэс фарміравання тэрыторыі БССР у 1921–1926 гадах». Якія гістарычныя падзеі паўплывалі на гэты працэс?

**I. З Маніфеста Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі** *(1 студзеня 1919 г.)*

Таварышы і браты працоўныя, бедныя сяляне і чырвонаармейцы Беларусі!

… Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя ў Расіі… заклала падмурак новага ўкладу жыцця з уладай працоўнага народа. Пачаўшыся з Расіі, яна запаліла таксама агонь сусветнага вызвалення працоўнага народа ад эксплуатацыі…

… Сярод працоўных народаў Расіі, Літвы, Украіны і Латвіі з сягонняшняга дня становіцеся і вы свабоднымі і паўнапраўнымі гаспадарамі свабоднай незалежнай Беларускай сацыялістычнай рэспублікі. З сягонняшняга дня Беларусь – Савецкая Рэспубліка – становіцца рэспублікай працоўнага народа, рабочых, сялянскай беднаты, чырвонаармейцаў Беларусі.

Часовы Рабоча-сялянскі ўрад ... абвяшчае ўсяму свету: з гэтага моманту ўся ўлада ў Беларусі належыць толькі Саветам рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў.

Уся зямля памешчыкаў і буйных землеўладальнікаў, манастыроў, цэркваў, касцёлаў, духавенства, з усім інвентаром, а таксама ўсе лясы, воды, нетры зямлі становяцца здабыткам працоўнага народа Беларусі….

**II. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.** *(па матэрыялах вучэбнага дапаможніка «Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас»).*

У працэсе пошуку і выпрацоўкі канкрэтных формаў аб'яднання савецкіх рэспублік у адну дзяржаву І. В. Сталін выступіў з ідэяй «аўтанамізацыі». Згодна з ёй усе савецкія рэспублікі павінны былі аб'явіць сябе састаўнымі часткамі Расійскай Савецкай Федэратыўнай Сацыялістычнай Рэспублікі (РСФСР) і ўвайсці ў яе склад на правах нацыянальна-культурнай аўтаноміі. Але гэты план не быў падтрыманы кіраўнікамі рэспублік, у тым ліку і Беларусі. У.І. Ленін прапанаваў іншую форму дзяржаўнага ладу - федэрацыю. Яна ўяўляла сабой

саюз некалькіх дзяржаў, у якім яны падпарадкоўваюцца адзінаму цэнтру і пры гэтым захоўваюць самастойнасць у вырашэнні асобных пытанняў унутранай палітыкі.

Ідэя У.І.Леніна была падтрымана на IV Усебеларускім з'ездзе Саветаў у снежні 1922 г. у Мінску. Дэлегаты з'ездааднагалосна адобрылі ідэю стварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (СССР).

30 снежня 1922 г. дэлегацыі, якія сабраліся ў Маскве на I Усесаюзным з'ездзе Саветаў, падпісалі Дэкларацыю і Дагавор аб утварэнні СССР. З'езд абраў вярхоўны заканадаўчы орган Саюза - Цэнтральны выканаўчы камітэт СССР. Яго старшынёй ад Беларусі быў абраны А.Р. Чарвякоў.

Урад СССР у 1924 г. выдаў дэкрэт аб перадачы Беларускай ССР 16 паветаў Віцебскай, Гомельскай і Смаленскай губерняў, якія раней уваходзілі ў РСФСР, у якіх большасць насельніцтва складалі беларусы. У 1926 г. адбылося другое ўзбуйненне БССР. У яе склад былі ўключаны Гомельскі і Рэчыцкі паветы. Гэта садзейнічала працэсу фарміравання беларускай нацыі, развіццю яе эканомікі і культуры.

**III. Картасхема. Тэрыторыя БССР у 1921–1939 гг.**

